Acta Albaruthenica

8

2008

Katedra Białorutenistyki
Uniwersytetu Warszawskiego

Polsko-białoruskie związki literackie, językowe i historyczno-kulturalne

Redakcja naukowa
Mikołaj Timoszuk i Mikołaj Chaustowicz

Warszawa 2008

Recenzenci:
prof. dr hab. Aleksander Barszczewski
prof. dr hab. Michaś Tyczyna

Skład i łamanie:
Lilia Ziemczonok

Projekt graficzny okładki:
Krzysztof Kleszcz

Publikacja dofinansowana przez *Komitet Badań Naukowych*

Na okładce: Літва. Гравюра XV ст. з *Сусветнай хронікі* Г. Шэдэля

© Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego

ISBN 978-83-60951-02-6
ISSN 1898-8091

Wydawca:
Katedra Białorutenistyki
Uniwersytetu Warszawskiego
ul. Szturmowa 4, 02-678 Warszawa
tel./fax (0 22) 55 34 244
http://www.kb.uw.edu.pl
e-mail: kb.wlsifw@uw.edu.pl

Druk i oprawa:
SOWA Sp. z o.o.
ul. Hrubieszowska 6a, 01-209 Warszawa
tel. (22) 431-81-40; fax (22) 431-81-50

Acta Albaruthenica 8/2008
ISSN 1898-8091

Радаслаў Калета

ВЫБРАНЫЯ ПРЫКЛАДЫ МАРФАЛАГІЧНАЙ ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫІ ПАМІЖ ДВУМА ПРАВАПІСНЫМІ СТАНДАРТАМІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

У артыкуле асаблівая ўвага адводзіцца адрозненням паміж тарашкевіцай ды наркомаўкай на прыкладзе выбраных пытанняў, звязаных з назоўнікам і прыметнікам. Параўноўваюцца тры выданні Тарашкевічавай *Беларускай граматыкі для школ* (з 1918[1], 1929[2] і 1943[3] гг.) на фоне: гаворак, граматыкі Ломцева[4], якая адлюстроўвае змены, уведзеныя ў 1933 годзе рэформай Савета Народных Камісараў[5], сучасных афіцыйных граматык па беларускай мове[6], а таксама каментараў мова-знаўцаў.

Пытанні правапісу абмяркоўваліся ўсебакова рознымі даследчыкамі[7]. Мэта артыкула – гэта не толькі параўнанне варыянтаў правапісу,

---

[1] *Biełaruskaja hramatyka dla szkoł. Napisau kandydat filolohii Pietrahr. Univer. B. Taraszkiewicz, Wilnia 1918 h., wydańnie Biełaruskaha wydawieck. T–WA Wilnia 1931 h, Drukarnia J. Lewina, Wilnia, Niamieckaja 22*. (далей азначаецца 1918 годам).

[2] Б. Тарашкевіч, *Беларуская граматыка для школ*, Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва, Нью-Ёрк, 1992, перавыданне з 1929 г. Іншае выданне: Выдавецтва „Народная асвета" Дзяржаўнага камітэта БССР, Выданне падрыхтавана па экземпляры, які захоўваецца ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, Серыя „Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць", Мінск 1991. Старонкі ў абодвух выданнях супадаюць (далей азначаецца 1929 годам). Паводле гэтага выдання выйшаў *Беларускі правапіс*, Мінск 1941.

[3] Б. Тарашкевіч, *Беларуская граматыка*, выданьне шостае, Менск 1943 дапаўненьні зрабілі: А. Адамовіч, А. Лёсік і К. Шкуцька, с. 54. (далей азначаецца 1943 годам). Паводле гэтага выдання выйшаў *Беларускі правапіс*, Розэнгайм 1950.

[4] Т. П. Ломтев, *Грамматика белорусского языка. Пособие для университетов, педагогических институтов*, Москва 1956 (далей азначаецца 1956 годам).

[5] Гл. *Пастанова Совета Народных Камісараў БССР № 1312, 26 жніўня 1933 г., Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу*, [у:] *Пратакол № 26 пасяджэння Совету Народных Камісараў Беларускай ССР 25 жніўня 1933 г., г. Менск*, с. 26–27, Нацыянальная акадэмія навук, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа, Аддзел рэдкай кнігі.

[6] У тым ліку акадэмічнага выдання *Кароткая граматыка беларускай мовы*, рэд. А. А. Лукашанец, Частка 1, выдавецтва Акадэміі навук, Мінск 2007 (далей азначаецца 2007 годам).

[7] Гл. напр.: P. J. Mayo, *Byelorussian orthography: from the 1933 Reform to the Present Day*, „The Journal of Byelorussian Studies" 1978, vol. IV, № 2; Н. Баршчэўская, *Рэформа 1933 году і стан нацыянальнае мовы ў Беларусі (на падставе лістоў у Беларускую Рэдакцыю Польскага Радыё)*, [у:] *Innowacje w językach*, т. 2, Zielona Góra 2002, с. 19–26;

але таксама паказанне зменаў у мове, у тым ліку ў афіцыйным стандарце. Кароткая гісторыя беларускага правапісу ды асноўныя марфалагічныя адрозненні паміж двума правапіснымі стандартамі абмяркоўваліся ў публікацыі *Асноўныя марфалагічныя адрозненні паміж наркомаўкай і тарашкевіцай*[8].

1. Выбраныя назоўнікі ніякага роду

Асаблівыя розніцы назіраюцца пры скланенні рознаскланяльных назоўнікаў. Істотныя разыходжанні выступаюць таксама ў выпадку іншых назоўнікаў ніякага роду, што выклікана большай арыентацыяй на паўднёва-заходні дыялект у выпадку правапісу, апрацаванага Б. Тарашкевічам, а ў выпадку правапісу, прынятага Саветам Народных Камісараў – на паўночна-ўсходні дыялект.

1.1. Назоўнік *імя*

У множным ліку Тарашкевіч піша толькі пра форму *імёны*[9]. Падае такія формы:

Н. В. К.	імёны
Р.	імёнаў
Д.	імёнам
Т.	імёнамі
М.	імёнах

У афіцыйных акадэмічных выданнях выступае яшчэ другая форма – *імі*[10]. Пра тое, што ў множным ліку назоўнік *імя* ўжываецца без суфікса *-ён-* альбо з суфіксам, чытаем і ў падручніку *Беларуская мова* з 1992 года[11]. У іншых наркомаўскіх крыніцах знаходзім інфармацыю, што згаданы назоўнік ўжываецца толькі з суфіксам *-ён-* (*імёны*)[12], значыць так, як падае Тарашкевіч.

І. Клімаў, *Рэформа 1933 года: перадумовы і наступствы*, „Роднае слова" 2003, № 12, с. 24–26; І. Клімаў, *Гісторыя складвання двух стандартаў у беларускай літаратурнай мове*, „Роднае слова" 2004, № 6, с. 41–47; І. Клімаў, *Лінгвістычная апазіцыя двух стандартаў беларускай літаратурнай мовы*, „Роднае слова" 2004, № 7, с. 14–18; А. Падлужны, *Традыцыі ва ўпарадкаванні беларускага правапісу*, „Роднае слова" 2005, № 8, с. 44–48; С. Запрудскі, *Абмеркаванне праблем правапісу ў пачатку – сярэдзіне 1920-х гг.*, „Роднае слова" 2005, № 9, с. 30–32; С. Запрудскі, *Распрацоўка правапісу беларускай мовы ў канцы 1920-х гг.*, „Роднае слова" 2005, № 10, с. 39–42.

[8] Гл. Радаслаў Калета, „Acta Albaruthenica" 2007, № 7, с. 192–206.

[9] 1929, с. 78.

[10] *Граматыка беларускай мовы*, том I, *Марфалогія*, Мінск 1962, с. 85 (далей азначаецца 1962 годам). 2007, с. 166.

[11] Пад рэдакцыяй Я. М. Адамовіча, А. М. Клачко, Мінск 1992, с. 163 (далей азначаецца 1992 годам).

[12] Гэта апрацоўкі выдадзеныя пазней за акадэмічную граматыку з 1962 г. і падаюць іншую інфармацыю, гл. *Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія*, пад рэд. Ф. М. Янкоўскага, Мінск 1980, с. 63. *Беларуская мова*, пад рэд. Л. М. Грыгор'евай, Мінск 1994, с. 151. (далей азначаюцца годам выдання).

Аднак у выданні Тарашкевічавай граматыкі з 1943 г., якое дапоўнілі: А. Адамовіч, А. Лёсік і К. Шкуцька, выступаюць дзве формы: *імёны*, *іменьні*, ды не ўзгадваецца ўвогуле форма *імі*, вядомая афіцыйным крыніцам.

Н. В. К. імёны, іменьні
Р. імёнаў, іменьняў
Д. імёнам, іменьням
Т. імёнамі, іменьнямі
М. імёнах, іменьнях[13]

1.2. Назоўнікі, якія азначаюць маладых істот

Варта звярнуць увагу на канчаткі роднага склону множнага ліку назоўнікаў, якія азначаюць маладых істот. Асноўныя адрозненні зводзяцца да размежавання канчаткаў: нулявы на наркомаўцы: *ягняты – ягнят*[14], ды канчатак *-аў* на тарашкевіцы: *ягняты – ягнятаў*[15].

Склон ды лік	*1918*	*1929, 1943*	*Наркомаўка*
Родны мн. ліку	jahniat, -аў[16]	ягнятаў	ягнят

1.3. Назоўнікі: *акно, вока, вуха*

У табліцы чарговыя адрозненні слоў у ніякім родзе паміж тарашкевіцай ды наркомаўкай.

Склон і лік	*Тарашкевіца*[17]	*Наркомаўка*[18]
Назоўны адз. і мн. ліку	вакно – вокны	акно – вокны
Давальны мн. ліку	вачом, вушом	вачам, вушам
Творны мн. ліку	вачмі, вушмі	вачамі / вачыма[19], вушамі / вушыма[20]
Месны мн. ліку	вачох, вушох	вачах, вушах
Месны адз. ліку	вусе	вуху

У слове *акно* бачная розніца толькі ў адзіночным ліку пры выкарыстанні тарашкевіцай прыстаўнога *в-*. У апошніх словах адрозненні назіраюцца ў націскных канчатках (давальны, месны – так як у муж-

---

[13] 1943, с. 57.
[14] 1962, с. 86–87. Л. І. Бурак, *Сучасная беларуская мова*, Мінск 1974, с. 134 (далей азначаецца 1974 годам). 1980, с. 63. 1992, с. 168. 1994, с. 150. 2007, с. 165.
[15] 1929, с. 78; 1943, с. 57.
[16] 1918, с. 35.
[17] 1918, с. 34; 1929, с. 77; 1943, с. 56–57.
[18] 1962, с. 61, 89, 142–143.
[19] Л. Баршчэўскі, *Беларуска-лацінска-еўрапейскі слоўнік*, Вроцлаў 2008, с. 45. 2005, с. 124.
[20] 2005, с. 124.

чынскім родзе) ды чаргаванні зычных (месны адз. ліку); у творным склоне Тарашкевіч прапануе архаічны канчатак *-мі*, які выступае ў назоўніках некаторых гаворак, здараюцца таксама адрозненні ў націску, напр. *вочм'і*[21]. Не падае аднак формы даўняга парнага ліку (*вачыма*), якая часткова выступае ў паўднёва-заходнім дыялекце[22].

1.4. Назоўнік *плячо*

Назіраецца іншае скланенне слова *плячо* ў множным ліку. Назоўнік *плячо* ў абодвух правапісных варыянтах адрозніваецца націскам і склонавымі канчаткамі ў множным ліку.

Склон	*Тарашкевіца*[23]	*Наркомаўка*[24]
Назоўны/вінавальны	плечы	плечы
Родны	плеч //-аў	плячэй
Давальны	плечам	плячам
Творны	плечамі / плячмі / плячыма	плячамі / плячыма[25]
Месны	плечах / плячох	плячах

У родным склоне іншыя канчаткі: *ø, -аў // -эй*. Розніца ў націску – у давальным, творным і месным склонах. У творным склоне ў тарашкевіцы захаваўся архаічны канчатак *-мі* (*плячмі*), які выступае ў назоўніках некаторых гаворак[26]. Рэшткі форм парнага ліку бачныя ў слове *плячыма*[27]. „Окончание множественного числа *-ыма* представляет собой по происхождению окончание двойственного числа, которое получило значение множественного числа в связи с исчезновением категории двойственного числа”[28].

2. Назоўнікі жаночага роду[29]

2.1. Назоўнікі тыпу *магчымасць* у множным ліку

Правапіс беларускай мовы[30] падае правіла[31], што назоўнікі жаночага роду тыпу *асаблівасць, здольнасць, меншасць, радасць* у множным ліку могуць мець канчатак *-яў*: *народнасцяў, меншасцяў*, аднак адзначаецца, што можа выступаць і канчатак *-ей*: *народнасцей, мен-*

---

[21] Э. Блінава, Е. Мяцельская, *Беларуская дыялекталогія*, Мінск 1969, с. 75.
[22] Тамсама, с. 63.
[23] 1918, с. 32; 1929, с. 76; 1943, с. 56.
[24] 1962, с. 89. 2007, с. 146.
[25] *Беларуска-лацінска-еўрапейскі слоўнік*, тамсама, с. 45. 2005, с. 124.
[26] Э. Блінава, Е. Мяцельская, тамсама, с. 75.
[27] Тамсама, с. 63. У гаворках Слуцкага р-на і Палкава Дзяржынскага р-на, дзе адначасова ўжываюцца і формы *пл'ачам'і*.
[28] 1956, с. 76.
[29] Гл. Радаслаў Калета, *Асноўныя марфалагічныя адрозненні...*, тамсама.
[30] Менск 1934. Выдавецтва Беларускай Акадэміі Навук.
[31] Правіла 52, с. 30–31.

шасцей. У акадэмічнай граматыцы з 1962 г. канчатак *-яў* быў прыняты як дыялектны, значыць як адхіленне ад нормы, але ўжо ў *Гісторыі беларускай літаратурнай мовы*, выдадзенай усяго некалькі гадоў пазней – у 1968 г., сцвярджаецца, што рэгулярны характар мае напр. назоўнік *уласцівасцяў*[32]. Большасць граматык аднак паслядоўна падавала формы з канчаткам *-ей* як адзіным правільным. Сучасныя апрацоўкі ставяцца да гэтага пытання ўжо інакш – зноў адзначаецца варыянтнасць канчаткаў, напр. *сенажацей – сенажацяў*[33]. І. Клімаў даказвае, што гэтыя канчаткі адрозніваюць сучасную тарашкевіцу (*магчымасьцяў*) ад наркомаўкі (*магчымасцей*)[34]. Самае новае акадэмічнае выданне таксама падае два канчаткі, і дадае, што выкарыстанне канчатка *-яў* у сучасным маўленні мае тэндэнцыю да пашырэння ды нарматыўнага замацавання[35]. Падаюцца прыклады: *магчымасцяў*, *якасцяў*, *урачыстасцяў*[36], прычым не сцвярджаецца, што гэтыя формы характэрныя толькі класічнаму правапісу.

Канчатак *-ей* выступае ў расійскай мове, напр.: *моделей, солей, пристаней, связей*, таму ў беларускай мове некаторымі даследчыкамі ўспрымаецца як іншамоўны ўплыў, якога трэба пазбягаць[37]. Калі так, то гэтаму ўплыву падлягаў таксама сам Тарашкевіч, які ў сваёй граматыцы сцвярджае, што назоўнікі жаночага роду, якія ў назоўным склоне адзіночнага ліку не канчаюцца на *-а*, маюць у родным склоне множнага ліку канчатак *-ей* альбо *-аў*[38], прычым падае такія прыклады: *касьцей*, *саней*, *грудзей*, *ночаў*, *печаў*. У іншых месцах ён сам ужывае назоўнікі тыпу *асаблівасць* з канчаткам *-ей*, напр. *асаблівасьцей*[39], *мясцовасьцей*[40]. У выданні з 1929 г. адсутнічаюць формы, якія канчаюцца на *-сьцяў*. Затое Тарашкевіч дадае, што нават назоўнікі, у якіх звычайна выступае канчатак *-аў*, могуць часам ужывацца з канчаткам *-эй*, напр. *ночаў – начэй*, *печаў – пячэй*. Калі аднак узяць пад увагу назоўнікі жаночага роду, якія ў назоўным склоне адзіночнага ліку канчаюцца на *-а*, то ў родным склоне множнага ліку Тарашкевіч аддае перавагу канчатку *-аў, (-яў)*[41].

---

[32] І. І. Крамко, А. К. Юрэвіч, А. І. Яновіч, *Гісторыя беларускай літаратурнай мовы*, том II, Мінск 1968, с. 300.

[33] 1992, с. 171.

[34] І. Клімаў, *Лінгвістычная апазіцыя двух стандартаў беларускай літаратурнай мовы*, тамсама, с. 15.

[35] 2007, с. 161.

[36] Тамсама.

[37] Гл. П. Сцяцко, *Культура мовы*, Мінск 2002, с. 69. Аўтар прадстаўляе, як да справы адносяцца розныя навуковыя апрацоўкі, прычым яны часта пярэчаць адна адной, нават калі іх рэдактарам з'яўляецца той самы даследчык. Ст. Станкевіч, *Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР*, Мінск 1994, с. 29.

[38] 1929, с. 82–83.

[39] 1929, напр. с. 12, §26 с. 31, с. 32.

[40] 1929, напр. §7 с. 13.

[41] Гл. Р. Калета, *Асноўныя марфалагічныя адрозненні...*, тамсама, с. 203–205.

2.2. Назоўнік *маці*

У назоўніку *маці* назіраецца вялікая розніца ў скланенні паміж аналізаванымі правапіснымі правіламі. У выданні з 1918 г. *маці* выступае ў адзіночным ліку ва ўсіх склонах апрача творнага, а ў множным ліку толькі ў назоўным, вінавальным і клічным. У творным склоне адзіночнага ліку і ў родным, давальным, творным ды месным множнага ліку скланяецца назоўнік, які паходзіць ад формы *матка*. У іншых выданнях згаданая форма выступае ва ўсіх склонах множнага ліку. У назоўным адзіночнага ліку існуе таксама форма *маць* побач *маці*.

Наркомаўка адрозніваецца найбольш – назоўнік *маці* ва ўскосных склонах[42] адзіночнага ліку, а таксама ва ўсіх склонах множнага ліку скланяецца з устаўкай *-ер-*, а калі ўжываецца без гэтай устаўкі, мае ва ўсіх склонах адзіночнага і множнага ліку адну форму[43]. У *Беларуска-лацінска-еўрапейскім слоўніку* як форма роднага склону падаецца *мацеры*[44].

Адзіночны лік	*1918*[45]	*1929*[46] *1943*[47]	*Наркомаўка*[48]
Н.	macі	маці (маць)	маці / маці
Р.	macі	маці	мацеры / маці
Д.	macі	маці	мацеры / маці
В.	macі	маці	мацеру, маці[49] / маці
Т.	matkaju	маткаю	мацерай (-аю) / маці
М.	macі	маці	мацеры / маці
Множны лік	*1918*	*1929, 1943*	*Наркомаўка*[50]
Н.	macі	маткі	маці / мацеры / мацяры
Р.	matak	матак	маці / мацярэй / мацярэй
Д.	matkam	маткам	маці / мацярам / мацерам
В.	macі	матак	маці / мацярэй / мацярэй
Т.	matkami	маткамі	маці / мацярамі / мацерамі
М.	matkach	матках	маці / мацярах / мацерах

Такія формы знаходзяцца ў граматыках. Аднак у літаратуры сустракаем таксама іншыя, напр.: *мама*, *матка*, *мацерка* (разм. –

---

[42] Паводле граматыкі з 2007 г. за выключэннем вінавальнага, с. 161.

[43] 1962, с. 90–91. 2007, с. 161–162.

[44] *Беларуска-лацінска-еўрапейскі слоўнік*, тамсама, с. 274.

[45] с. 40.

[46] с. 83.

[47] с. 61.

[48] 1962 с. 90–91. Толькі другая форма выступае ў В. М. Сіўковіч, *Сучасная беларуская мова. Даведнік*, Мінск 2005, с. 111 (далей азначаецца 2005 годам).

[49] Гэтую форму замест формы *мацеру* падае граматыка з 2007 г., с. 162.

[50] Першыя дзве формы падаюць граматыкі 1962 і 2007, апошнюю – 1974.

часцей у формах множнага ліку – *мацеркі*, *мацяркі*), *матуля* (разм., ласк.), *матухна* (разм. – звычайна з адценнем павагі), *мамуля* (разм., ласк.), *мамуся* (разм., ласк.)[51]. Ёсць і памяншальна-ласкальныя формы, якімі называецца маці ды якія ўжываюцца пры звароце да маці: *мамка*, *мамачка*, *матачка*. У мове фальклору часта ўжываюцца формы: *мамачка*, *матачка*, *матулечка*[52].

Вось якія варыянты скланення выступаюць у гаворках:

Гаворкі[53]		
Склоны	Заходнія ды поўночныя	Розныя
Н.	маць'і	маць'і, маты, матка, матэра, матэр
Р.,Д.,М.	маць'і	маць'еры, матэры, матыра
В.	маць'і	маць'і, матэру, матыра
Т.	маць'і	маць'ерай, матэрай
Мн. лік		
Усе	маць'і	маць'арк"е, маць'арк"і, м'ац'ары, маць'ер'э, матэр'э, м'атк'і, матк"е[54]

У жывых гаворках у назоўным склоне адзіночнага ліку сустракаюцца яшчэ формы: *мамка*, *мамачка*, *мамулечка*, *мамулёк*, *матулёчак*, *мамуська*, *мамусечка*, *мамусёк*, *мамусёчак*[55].

Трэба адзначыць, што ў адзіночным ліку як тарашкевіца (з выключэннем творнага склону), так наркомаўка прыводзяць нескланяльную форму *маці*, якая выступае на захад ды поўнач ад лініі Орша – Талачын – Магілёў – Краснаполле – Чачэрск – Жлобін – Парычы – Мар'іна Горка – Узда – Баранавічы – Жалудок – Ліда[56].

Аднак наркомаўка (у адрозненне да тарашкевіцы), якая імкнецца да элімінацыі выключэнняў, падае згаданую форму таксама ў множным ліку, бо гэтая форма выступае і на поўнач ад згаданай лініі, значыць і ў паўночна-ўсходнім дыялекце. У Тарашкевіча гэта сумесь з розных гаворак.

---

[51] М. Крыўко, *МАМА, МАМАЧКА, ТАТА, ТАТАЧКА. Назвы маці, бацькі і іх сінонімы ў літаратурнай мове і ў фальклоры*, „Роднае слова" 2005, № 10, с. 27–28. Аўтар падае шмат прыкладаў выкарыстання гэтых слоў у беларускай літаратуры.

[52] Тамсама, с. 28.

[53] Э. Блінава, Е. Мяцельская, тамсама, с. 72. Падзел у табліцы прыблізны, таму што нельга размежаваць тут гаворак на два віды дыялектаў. Нават на поўдні ёсць адрозненні ў залежнасці ад раёну. Інакш скланяецца гэтае слова напр. на Палессі. Нават аўтаркі не даюць дакладнага падзелу, а толькі агульна пішуць пра варыянты, якія назіраюцца ў розных гаворках.

[54] У крыніцах не падаюцца формы, якія выступаюць у Беларусі, таму тут адклікаемся да формаў з Беласточчыны, пар. *Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny*, т. 1, Ossolineum 1980, с. 98 пад XVII п. Stosunki pokrewieństwa.

[55] М. Крыўко, тамсама, с. 29.

[56] Э. Блінава, Е. Мяцельская, тамсама, с. 72.

4. Парны лік[57]

У Тарашкевіча захавалася форма парнага ліку. Згадвалася ўжо пра форму *плячыма*. Парны лік выступае таксама ў назоўніках жаночага роду ў спалучэнні з лічэбнікамі: *дзве, тры, чатыры* напр. *дзьве назе, дзьве руцэ*. У беларускай мове няма форм *два стала, два брата*[58], тыповых для расійскай мовы.

„В древнем языке были ещё формы двойственного числа: *дзве назе, дзве акне* вместо современных литературных форм: *дзве нагі, два акны*. Формы двойственного числа начали исчезать в языке в XIV в. В памятниках XVI в. формы двойственного числа встречались уже очень редко”[59]. Сёння ў наркомаўцы назіраюцца рэшткі парнага ліку, напр. *сястра – сёстры*, ды *дзве сястры*, *акно – вокны*, ды *два акны*.

Падсумоўваючы марфалагічную дыферэнцыяцыю паміж двума правапіснымі стандартамі ў катэгорыі назоўніка, трэба адзначыць, што ў большасці выпадкаў тарашкевіца абапіраецца на паўднёва-заходнім дыялекце, а наркомаўка – на паўночна-ўсходнім. Але варта памятаць, што гэты падзел не заўсёды захоўваецца, таму што існуюць формы, якія сустракаюцца ў абодвух дыялектах, напр. назоўнік *матка* пераважае ва ўсходніх гаворках, але гэта не значыць, што не выступае там і слова *маці*[60] – якраз гэтую форму (а не *матка*) сустракаем у наркомаўцы. Тарашкевіч падае гэтую самую форму, таму што яна пашыраецца таксама на поўначы і ўсходзе Беларусі.

5. Прыметнік

У граматыцы Тарашкевіча прыметнік называецца *прыметай*[61], *прыметнікам* альбо *імем прыметным*[62]. Параўнанне склонавых канчаткаў разглядалася ў артыкуле *Асноўныя марфалагічныя адрозненні паміж наркомаўкай і тарашкевіцай*[63]. Тут аналізуюцца ступені параўнання.

5.1. Ступені параўнання

У Тарашкевіча вылучаюцца тры ступені параўнання: 1-ая ступень называецца *звычайнай,* 2-ая – *вышэйшай*, 3-ая – *найвышэйшай*[64]. Сённяшнія апрацоўкі, невядома чаму, вылучаюць толькі дзве ступені[65]: *вышэйшую* і *найвышэйшую,* ды час ад часу ўзгадваюць *зыходную*

---

[57] Пар. І. І. Крамко, А. К. Юрэвіч, А. І. Яновіч, тамсама, с. 169.

[58] Гл. 1929, с. 69; 1943, с. 50.

[59] 1956, с. 65.

[60] Гл. *Дыялекталагічны атлас беларускай мовы*, Мінск 1963, карта 89.

[61] 1918, с. 42.

[62] 1929, с. 18–19; 1943, с. 13.

[63] Гл. Р. Калета, „Acta Albaruthenica” 2007, тамсама.

[64] 1918, с. 44; 1929, с. 87; 1943, с. 64.

[65] 1962, с. 162. 1980, с. 92. 1992, с. 181. 1994, с. 163. 2005, с. 138–141. 2007, с. 239. А. Р. Мурашка, *Ступені параўнання якасных прыметнікаў* (*Па матэрыялах Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы*), „Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР” 1961, вып. VIII, с. 206.

форму (а не ступень). Тэрміналагічная рэдукцыя зыходнай ступені да зыходнай формы, якая часта нават увогуле не падаецца, здзіўляе тым больш, што ў сур'ёзным выданні якраз чытаем: „Прыметнікі з якасным значэннем маюць ступені параўнання: звычайную, вышэйшую і найвышэйшую"[66].

5.1.1. Вышэйшая ступень

У Тарашкевіча[67] выступае форма *wialiki – wialikšy*. У наркомаўцы – форма *вялікі – большы*. У самай новай афіцыйнай акадэмічнай апрацоўцы чытаем: „слова *вялікшы* ў беларускай мове няма, а вышэйшая ступень ад *вялікі* паходзіць ад іншай асновы (*большы*)"[68].

З другога боку, у наркомаўцы можна сустрэць форму *добры – дабрэйшы*[69], побач – *лепшы*. У Тарашкевіча выступае толькі гэтая нерэгулярная форма[70] (падобным чынам і ў гаворках[71]).

Тарашкевіч нічога аднак не піша, ці можна дадаткова ўтварыць вышэйшую ступень пры дапамозе слова *больш,* да якога далучаецца прыметнік у звычайнай (як у літаратурнай мове[72] і гаворках[73]), альбо вышэйшай ступені (сустракаецца ў гаворках[74] – успрымаецца як памылка ў літаратурнай мове, таму што двойчы перадаецца адно значэнне, якое зацямняе сэнс; для больш эмацыйнага эфекту замест **больш цікавейшы* лепш сказаць *яшчэ // куды цікавейшы // больш цікавы*[75]).

Прыметнік у вышэйшай ступені часта выступае з прыназоўнікамі – у Тарашкевіча гэта *ад, за*[76]. Яны выступаюць і ў гаворках[77]. У наркомаўцы розныя варыянты: *вышэйшы за яго; старэйшы ад яго; смялейшы, чым // як ён*[78]. В. М. Сіўковіч не падае толькі прыназоўніка *за*[79] (які ёсць у акадэмічным выданні), што здзіўляе, паколькі менавіта гэты прыназоўнік з'яўляецца больш тыповым для беларускай мовы – ён пашыраны ў народнай мове, а акрамя гэтага ў такіх сінтаксічных канструкцыях адсутнічае ў расійскай мове[80].

---

[66] *Беларуская мова. Энцыклапедыя*, пад рэд. А. Я. Міхневіча, Мінск 1994, с. 434.

[67] Толькі ў выданні 1918, с. 44.

[68] 2007, с. 240.

[69] 1956, с. 83.

[70] 1918, с. 44; 1929, с. 87; 1943, с. 64.

[71] А. Р. Мурашка, тамсама, с. 207.

[72] П. Сцяцко, тамсама, с. 76.

[73] Э. Блінава, Е. Мяцельская, тамсама, с. 88.

[74] Тамсама.

[75] П. Сцяцко, тамсама, с. 76. 2007, с. 240.

[76] Хаця гэтыя прыназоўнікі Тарашкевіч падае, гаворачы аб найвышэйшай ступені, пар. тамсама.

[77] Э. Блінава, Е. Мяцельская, тамсама, с. 87. А. Р. Мурашка, тамсама, с. 206, 210–211. У найвышэйшай ступені А. Р. Мурашка падае яшчэ такія формы: *чым*, *над*, *як*.

[78] 1956, с. 85. 2007, с. 241.

[79] Пар. тамсама, с. 139.

[80] Пар. Ст. Станкевіч, *У вабароне роднае мовы*, у: „Бацькаўшчына", №№ 104–105, Мюнхэн, 29 чэрвеня 1952, с. 6; Н. Баршчэўская, *Беларуская эміграцыя – абаронца роднае мовы*, Варшава 2004, с. 186.

5.1.2. Найвышэйшая ступень

У Тарашкевіча[81] выступае форма *wialiki – najwialikšy*, побач форм *samy wialiki, ad usich najwialikšy*. У наркомаўцы – форма *вялікі – найбольшы*. У рэдкіх выпадках – форма *найвялікшы*[82]. Гэтая форма лічыцца размоўнаю[83].

Магчымыя формы найвышэйшай ступені ў табліцы:

Тарашкевіца	*Наркомаўка*	*Гаворкі*
najwialikšy	найбольшы, найвялікшы	найбол'шы
samy wialiki	самы вялікі, самы цікавейшы[84], самы найцікавейшы[85]	самы салотк'і, самы разумн'ейшы[86] самы найбрыччэйшы
ad usich najwialikšy	найбольш вялікі	
za ŭsich najzielaniejšy	найадважны[87]	

Арыгінальным на гэтым фоне з'яўляецца погляд Ст. Станкевіча, паводле якога, у беларускай мове правільныя толькі два способы ўтварэння найвышэйшай ступені параўнання: пры дапамозе прыстаўкі *най-* і прыслоўя *сама*, напр. Н. *сама багаты,* Р. *сама глухіх*. Формы *самы багаты, самых глухіх* успрымаюцца ім як русізм[88], але – як бачым – яны знаходзяцца ўжо ў першай выдадзенай[89] беларускай граматыцы.

---

[81] Толькі ў выданні 1918, с. 44.

[82] 2005, с. 140.

[83] 2007, с. 240.

[84] Большасць граматык не падае гэтай формы. Выступае яна ў граматыцы 1962, с. 168–169. Гл. таксама *Беларуская мова. Энцыклапедыя*, таксама, с. 435. Гэтая форма дапускаецца граматыкай 2007 г., калі неабходна падкрэсліць асаблівае значэнне найвышэйшай ступені якасці, с. 240–241.

[85] Формы створаныя падобным чынам сустракаем яшчэ ў граматыцы Ломцева, 1956, с. 85 (напр. *самы найвышэйшы*). Сёння гэтая форма выкарыстоўваецца толькі ў стылістыцы як мастацкі сродак дзеля выражэння моцных эмоцый, напр. захапленне. Аднак Э. Смулкова сцвярджае, што да часткі *самы* можа далучацца прыметнік у кожнай ступені. Гл. *Konstrukcje porównawcze typu gradacyjnego w języku białoruskim*, [у:] *Zagadnienia kategorii stopnia w językach słowiańskich*, пад рэд. Г. Ажэхоўскай, Варшава 1976, с. 110. Гэтая форма дапускаецца граматыкай 2007 г., калі неабходна падкрэсліць асаблівае значэнне найвышэйшай ступені якасці, с. 240–241.

[86] А. Р. Мурашка, тамсама, с. 210. Астатнія прыклады: Э. Блінава, Е. Мяцельская, тамсама, с. 88.

[87] Гэты спосаб утварэння (прэфікс *най-* і звычайная ступень) падае граматыка 1962, с. 168–169.

[88] Ст. Станкевіч, *Русіфікацыя беларускае мовы…*, тамсама, с. 29–30.

[89] K. Gutschmidt лічыць, што аўтарам першай граматыкі быў А. Луцкевіч, які на віленскіх курсах (1915–1916) чытаў лекцыі будучым настаўнікам па беларускай мове ды на іх патрэбы стварыў граматыку, якую намерваўся надрукаваць. Гл. *Хто напісаў першую граматыку беларускай літаратурнай мовы*?, „Prace Filologiczne" 1999, том XLIV, с. 193–199.

5.2. Кароткія формы

Толькі ў выданнях 1929 і 1943 гг.[90] Тарашкевіч піша пра *скарочаныя прыметнікі*. Падае такія формы: *грозен, боязен, чоран, сіня туча, чорна мора, сіні тучы, ясны вочы, добры людзі*. У іншых склонах кароткія формы сустракаюцца рэдка: *грозна мужа, грозну мужу; сіня мора, сіню мору*.

У наркомаўцы выступаюць такія прыклады: *мілі – міла, хіцёр – хітра, молад – молада, жыў – жыва, здароў – здарова, рад – рада, ровен – раўна, ясен – ясна*[91] і інш. У акадэмічным выданні чытаем, што ў літаратурнай мове кароткія формы якасных прыметнікаў ужываюцца толькі ў ролі выказніка альбо іменнай часткі састаўнога ці складанага выказніка (нярэдка ў застылых выразах). Кароткую форму могуць мець прыметнікі, якія азначаюць унутраны стан альбо знешнія прыметы і якасці асобы, напр.: *ахвоч, вінават, гол, сыт, багат, прыгож, жанат, весел, шырок, вузак, вялік, мал*[92]. Такія формы не з'яўляюцца адзінаўжывальнымі, утвараюцца і поўныя прыметнікі[93]. Новая акадэмічная граматыка дадае, што не ад усіх прыметнікаў утвараюцца кароткія формы – толькі ад тых, якія маюць невытворную аснову з адным канцавым зычным (*дуж*, *люб*). Калі аснова заканчваецца збегам зычных альбо гукам *в*, толькі адзінкавыя лексемы маюць здольнасць утвараць кароткую форму: *бедны – бедзен*, *згодны – згодзен*, *поўны – повен*, *гатовы – гатоў*, *здаровы – здароў*[94]. „Кароткія формы ў адрозненне ад поўных называюць прымету, што звязваецца з пэўным часам і не з'яўляецца пастаяннай (параўн.: *я весел* і *я вясёлы*)"[95]. Чытаем далей, што „кароткія формы прыметнікаў не змяняюцца па склонах і выступаюць заўсёды ў застылай форме назоўнага склону"[96] (у адрозненне ад Тарашкевічавай граматыкі).

У гаворках пераважаюць поўныя формы прыметнікаў, але сустракаюцца і кароткія, напр.: *здароў, х'іц'ер (х'іц'ор), пов'ен, рад, варт, н'адуж, в'інават, жыў*. Ужываюцца яны пераважна ва ўстойлівых зваротах, напр.: *гол йак сакол, х'іц'ер З'м'іц'ер*.

Кароткія формы часцей сустракаюцца ў паўночна-ўсходніх гаворках – выступаюць у ролі выказніка, напр.: *Астаўс'а чалав'ек адз'ін йак кол і гол йак мац'і радз'іла*[97].

У сучаснай беларускай мове кароткія формы характэрныя для прыналежных прыметнікаў альбо для прыметнікаў у ролі выказніка – у форме азначэння яны наогул не сустракаюцца[98].

---

[90] Адпаведна: с. 86; с. 64.
[91] 1956, с. 88.
[92] 1962, с. 172.
[93] Тамсама.
[94] 2007, с. 243.
[95] Тамсама.
[96] Тамсама.
[97] Э. Блінава, Е. Мяцельская, тамсама, с. 80.

На заканчэнне разгляду марфалагічнай дыферэнцыяцыі ў катэгорыях назоўніка і прыметніка трэба адзначыць, што *Кароткая граматыка беларускай мовы*, выдадзеная НАН РБ ў 2007 г., умацоўвае ранейшыя тэндэнцыі, напр. у назоўніках, якія азначаюць маладых істот, у родным склоне множнага ліку выступае нулявы канчатак (*ягняты – ягнят*), вылучае таксама толькі дзве ступені параўнання прыметнікаў.

Пашырае затое ўжыванне прыназоўніка *за* разам з прыметнікам у вышэйшай ступені, згодна з прапановай Браніслава Тарашкевіча, а таксама дае канчатку *-яў* назоўнікаў жаночага роду тыпу *магчымасць* у множным ліку нарматыўнае замацаванне, у чым адмаўляла акадэмічнае выданне з 1962 г. Гэта чарговыя доказы, што абодва правапісныя стандарты не заўсёды адрозніваюцца, а калі адрозніваюцца, то не толькі мяккім знакам.

[98] П. Сцяцко, тамсама, с. 72–75.